Мэта адна: напомніць пра тое, што п’янства – грэх, але спосабы дасягнення гэтае мэты розныя. К. Жэра з іроніяй абвяшчае годным смерці таго, хто не вып’е, а Ю. Бака пагражае смерцю таму, хто будзе піць. Але канец абодва прарочаць адзін – страта жыцця.

Такім чынам, кнігі Караля Жэры і Юзафа Бакі, напісаныя ў адну эпоху, здаецца, маюць на мэце адно: навучыць і павесяліць. “Езуіцкая стратэгія пісьма для народа стварала магчымасць злучэння закасцянелай рэлігійнай паэтыкі з элементамі папулярнага пісьменства, асабліва фальклору і махлярскай літаратуры” [6, с. 82]. Пісьменнікі будуюць свае кнігі як “няспыннае апракідванне ў смехавы свет усяго існага”, ствараюць своеасаблівую “эстафету смеху” [3, с. 370], пры гэтым падымаючы вельмі важныя і сур’ёзныя пытанні маральна-дыдактычнага характару.

**Літаратура**

1. Варда А. Об отношении автора к читателю в Росии XVIII века // Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе (Проблемы теоретической и исторической поэтики): В 2 ч. Ч. 2. Гродно: Гргу, 1998. 489 с.
2. Гаспаров М.Л. Афоризм // Литературная энциклопедия терминов и понятий / Под ред. А.Н. Никомокина. М., 2001. Стб. 63–64.
3. Лихачев Д.С. Историческая поэтика русской литературы. Смех как мировоззрение и другие работы. СПб.: Алетейя, 1997. 458 с.
4. Современный словарь-справочник по литературе / Т.Д. Венедиктова и др.; сост. и научн. ред. С.И. Кормилов. М.: АСТ: Олимп, 1999. 704 с.
5. Hernas Cz. Literatura baroku. Dzieje literatury polskiej. Warszawa: PWN, 1987. 316 s.
6. Nawarecki A. Czarny karnawał. “Uwagi śmierci niechybnej” księdza Baki – poetyka tekstu i paradoksy recepcji. Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich – Wydawnictwo, 1991. 377 s.
7. Żera K. Vorago rerum. Torba śmiechu. Groch z kapustą. A każdy pies z innej wsi… Warszawa: Państwowy instytut wydawniczy, 1980. 324 s.

**Ф.В. Драбеня**

## АСЭНСАВАННЕ ГІСТОРЫІ НАРОДА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

У 1990–2000-х гадах у беларускай драматургіі, як і ў папярэднія дзесяцігоддзі, актыўна развівалася менавіта драма з яе разнастайнымі жанравымі формамі і падвідамі.

Мінулае народа заўсёды прыцягвала майстроў слова. У звароце драматургаў да мінулага праяўляецца імкненне да мастацкага аналізу

гісторыі, да яе аб’ектыўнай ацэнкі з вышынь сучаснасці. Калі гаворка ідзе пра гістарычную драматургію, то найперш згадваюцца імёны А. Петрашкевіча і А. Дударава. Гістарычныя трагедыі і драмы А. Петрашкевіча і А. Дударава прысвечаны найбольш напружаным старонкам з мінулага беларускага народа. У цэнтры кожнага з сюжэтаў п’ес – барацьба за нацыянальную незалежнасць, моманты з гісторыі Беларусі, якія маглі б стаць ці сталі пераломнымі ў далейшым развіцці дзяржавы. Драматургі імкнуцца адлюстраваць драматызм пэўнага часу праз стварэнне велічных вобразаў рэальных асоб, якія назаўсёды пакінулі свой след у гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

Трагічнасць гісторыі беларускай дзяржавы і наогул беларускай дзяржаўнасці ў тым, што, пачынаючы з часоў княжання першых уладароў, полацкага князя Рагвалода, напрыклад, і да XX ст., Беларусі прыходзілася змагацца за сцверджанне годнасці самастойнай краіны. І толькі выбітныя харызматычныя асобы маглі абудзіць народ, павесці яго за сабой на барацьбу за свабоду і незалежнасць. Між тым, гісторыя Беларусі зведала і перыяды росквіту і ўздыму. Перыяды росквіту беларускай дзяржавы занатоўваліся летапісцамі і гісторыкамі таго часу як залежныя ад ладу праўлення таго ці іншага князя. Беларуская гістарычная драматургія ў многім пацвярджае гэтую традыцыю адлюстравання гісторыі і рэпрэзентуе мінулае беларускіх земель менавіта праз мастацкі разгляд кіравання канкрэтнага вялікага князя, паказвае, як на развіццё краіны ўплывалі славутыя грамадскія і культурныя дзеячы.

Праблема засваення гісторыі ў сусветнай мастацкай літаратуры заўсёды займала важнае месца і станавілася яшчэ больш актуальнай у пераломныя моманты развіцця грамадства. Працэс адраджэння і чарговай беларусізацыі пачаўся пасля распаду СССР, калі Беларусь атрымала статус незалежнай дзяржавы. Да распаду СССР “гістарычная драма на сцэнічных падмостках абмяжоўвалася пераважна тэмамі Кастрычніцкай рэвалюцыі і Айчыннай вайны” [1, с. 56]. У 90-я гады XX ст., у час нацыянальнага адраджэння, зноў павысілася цікавасць да гістарычнага мінулага Беларусі і беларускіх земель, з’явілася вялікая колькасць гісторыка-мастацкіх твораў, якія ў той ці іншай ступені прадстаўляюць пэўную эпоху. Адлюстроўвае гісторыю і драматургія, якая звяртаецца да асвятлення пераломных момантаў як папярэдніх эпох, так і XX ст.

Найбольшага росквіту драматургія гістарычнай тэматыкі дасягнула ў 90-я гады XX ст., калі ў грамадстве былі і зноў запатрабаваны мастацкія

творы пра мінулае, калі адчувалася неабходнасць абудзіць цікавасць да гісторыі сваёй краіны, сцвердзіць годнасць свайго народа, калі беларускія пісьменнікі атрымалі больш шырокія магчымасці працаваць з гістарычнымі архівамі Беларусі і замежжа. Пры гэтым, як, вядома, “гістарычная драматургія, імкнучыся спасцігнуць мінулае, заўсёды застаецца фактам сучаснай літаратуры, асвятляючы мінулае святлом сённяшняга дня, гістарычная драма заўсёды шукала жывыя ўзаемасувязі мінулага і сучаснага і ў гэтым сэнсе асвятляла і сённяшняе святлом мінулага” [2, с 3].

Такім чынам, развіццё і станаўленне гістарычнай драмы нельга аддзяліць ад усіх літаратурна-мастацкіх і гістарычных працэсаў у краіне.

Драматургі на мяжы XX і XXI стст. часцей актуалізавалі перыяд кіравання Вітаўта і Ягайлы, княжанне Радзівілаў, паўстанне Кастуся Каліноўскага, перыяд Слуцкага паўстання і г. д. Разам са зваротам да старажытных перыядаў гісторыі беларускай дзяржавы аўтары выкарыстоўвалі сюжэты з XX ст., як пэўнай, ужо мінулай, гістарычнай эпохі, а менавіта асэнсоўвалі сумныя падзеі 30-х гадоў, калі ў краіне адбываліся масавыя рэпрэсіі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі.

У якасці галоўных герояў беларускія драматургі вылучаюць славутых людзей Беларусі (Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына, князь Вітаўт, Сымон Будны, Кастусь Каліноўскі, Янка Купала і іншыя), а таксама звязаныя з іх лесамі гістарычныя падзеі, якія ўплывалі на станаўленне беларускай дзяржаўнасці (Грунвальдская бітва 1410 г., паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі 1794 г., паўстанне 1883–1884 гадоў і інш.).

Адным з заснавальнікаў жанру гістарычнай драматургіі ў беларускай літаратуры варта лічыць У. Караткевіча, які ў гэтай мастацкай форме ўвасобіў, абудзіў з небыцця асобу Кастуся Каліноўскага (п’еса “Кастусь Каліноўскі”), гісторыю паўстання пад кіраўніцтвам Вашчылы (“Маці ўрагану”).

Важнае значэнне ў развіцці жанру гістарычнай драматургіі належыць А. Петрашкевічу, які здолеў прасачыць **усю гісторыю** беларускай дзяржаўнасці, стварыўшы сапраўды драматургічную гісторыю Беларусі: пачынаючы з X ст., калі было заснавана Полацкае княства, княжыў першы гістарычна вядомы князь Рагвалод (“Гора і слава”), і завяршаючы падзеямі 30-х гадоў XX ст.

Сярод апошніх па часе напісання твораў А. Петрашкевіча варта адзначыць такія, як “Рыцар Свабоды. Гістарычная трагедыя”, “Развітанне

з Радзімай. Гістарычная драма”, “Наканавана быць прарокам. Гістарычная трагедыя”, “Апошні збройны чын. Гістарычная трагедыя”, “Крыж святой Еўфрасінні. Фантасамагорыя” і інш.

Асабліва яскравым прыкладам гістарычнага жанру ў драматургічнай творчасці А. Петрашкевіча варта лічыць п’есу “Наканавана быць прарокам”, прысвечаную гісторыі XX ст., лёсу такой гістарычнай асобы, як Янка Купала. Алесь Петрашкевіч пераканаўча і з выразным патрыятычным пафасам паказаў стан рэчаў у культуры і грамадстве ў час усеагульных “чыстак” у БССР у 30-я гады, ён выдатна арыентуецца ў палітычнай сітуацыі ў краіне. Перад чытачом паўстаюць жудасныя карціны сталінскага тэрору, калі паэтаў прымушалі падпісваць “адмаўленні” ад сваіх поглядаў і думак. На старонках твора мы сустракаем сумна славутага “літаратуразнаўцу-крытыка” Бэндэ, які знаходзіў падставы для палітычных абвінавачанняў у адрас класікаў беларускай літаратуры. Аўтар уводзіць у сюжэт п’есы славутую фальсіфікацыю 30-х гадоў, гісторыю з выкрыццём “Саюза вызвалення Беларусі”, якое было накіравана супраць беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, што наўмысна абвінавачвалася ў нацыянал-дэмакратызме, контррэвалюцыі і антысавецкай дзейнасці. За вясну-лета 1930 г. было арыштавана больш за 100 дзеячоў беларускай навукі і культуры. Сярод іх шмат літаратараў – Максім Гарэцкі, Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча і іншыя. Самога ж Янку Купалу фальсіфікатары “ўвялі” ў кіраўніцтва так званага “Саюза вызвалення Беларусі”. Пра тое, як Купала пазбегнуў расстрэлу, і апавядае п’еса “Наканавана быць прарокам”.

Драматург паказвае і сям’ю паэта, яго дарадцу – Маці, занепакоеную лёсам сына. Прыведзеныя аўтарам кантрастныя паралелі паміж патрыятычнымі Купалавым памкненнямі і кан’юнктурнай актыўнасцю яго апанентаў найбольш ярка характарызуць атмасферу 30-х гадоў XX ст. у СССР, дзе людзі пішуць даносы адзін на аднаго, чакаючы, што сёння па іх прыдуць, каб арыштаваць. Сустракаем у п’есе і вобраз паплечніка Янкі Купалы – Якуба Коласа, які таксама знаходзіцца пад наглядам дзяржаўных карных органаў. Таксама, як і іншыя пісьменнікі, Якуб Колас жыве ў пастаянным страху за сваё жыццё і лёс сваёй сям’і. Добра вядомы факт, што Колас некалькі год клаўся спаць не распранаючыся, бо чакаў магчымага арышту. Менавіта таму ён і падпісвае так званае “адмаўленне” ад сваіх ідэй і ранейшай мастацкай творчасці 1910–20-х гадоў, своеасаблівае абяцанне на вернасць уладам 1930-х гадоў.

Канешне, А. Петрашкевіч ідэалізуе Янку Купалу ў яго паводзінах са следчымі з карных органаў. Ёсць у п’есе і вобраз Следчага, які вылучаецца

з агульнай сістэмы вобразаў тых, хто служыць таталітарнай сістэме Следчы ў п’есе выратоўвае Я. Купалу, папярэдзіўшы пра арышт, а сам канчае жыццё самагубствам. Аўтар насычае п’есу біяграфічнымі звесткамі пра Я. Купалу. Чаму ён, прарок-пясняр, паспрабаваў скончыць жыццё самагубствам? Ці не павінен ён даваць прыклад астатнім? Перш за ўсё Янка Купала – такі ж чалавек, як і астатнія, але паколькі ён – творчая асоба, то больш балюча адчувае заганы грамадства, у яго менш ілюзій наконт тых перспектыў развіцця грамадства, якія не змогуць спраўдзіцца. На шчасце, спроба самагубства скончылася няўдачай. Нават на бальнічным ложку Купалу пільнуюць прадстаўнікі карных органаў, нават тут яго прымушаюць падпісаць “адрачэнне”. Паэт падпісвае, бо разумее, што разумны чалавек не паверыць гэтай няпраўдзе. Такім чынам, у п’есе “Наканавана быць пракокам” А. Петрашкевіча разглядае ХХ ст. як завершаную гістарычную эпоху, чые падзеі робяцца сюжэтнай асновай для гістарычнай драмы, прычым канфлікт героя (Янка Купала) з іншымі персанажамі п’есы і самім часам з’яўляецца і канкрэтна-гістарычным, і маштабным, па-гістарычнаму значным.

Цікавай спробай новага звароту да гістарычнай асобы Кастуся Каліноўскага з’яўляецца п’еса А. Петрашкевіча “Рыцар Свабоды”. П’еса пачынаецца пралогам, дзе аўтар прыводзіць гістарычныя дакументы, а менавіта “Маніфест часовага ўрада Літвы і Беларусі”, а таксама “Рэскрыпт” Аляксандра II, які і з’яўляецца непасрэдным загадам да падаўлення паўстання беларускага народа. Таксама выкарыстоўваюцца публіцыстычныя творы самога кіраўніка паўстання, вядомы верш “Марыська чарнабрэва, галубка мая”. Акрамя вышэй узгаданых матэрыялаў аўтар прыводзіць і тэкст заявы ад імя губернскага маршалака шляхты Дамейкі Аляксанада Фадзеевіча, дзе аспрэчваюцца дзеянні рэвалюцыйнай партыі, а таксама прызнаецца адзінства з Расіяй. Тым самым аўтар насычае свой твор сапраўднымі гістарычнымі дакументамі, якія дазваляюць чытачу (гледачу) зразумець гістарычнае становішча ў час паўстання 1863–1864 гадоў.

У п’есе адлюстравана рэальнае двухмоўе: прадстаўнікі расійскай улады размаўляюць па-руску. Сярод іх: сумна вядомы Мураўёў-вешальнік, а таксама следчыя, якія вядуць справу К. Каліноўскага (Лосеў, Шалгуноў, Гогель, Сямёнаў). Вобраз К. Каліноўскага ў п’есе пазбаўлены чалавечых заганаў. Гэта ідэальны, рамантызаваны вобраз змагара за свабоду і незалежнасць. Кіраўнік паўстанцаў паводзіць сябе як мужны змагар і да канца адданы справе вызвалення роднай зямлі ад чужынскага засілля.

Турэмны ўрач так кажа пра К. Каліноўскага: “… у человека отняли все, что могли, заживо хоронят в этих холодных острожских “мурах”, вырваться из которых уже нет никакой надежды, а человек всё равно борется за жизнь, ищет возможность наполнить содержанием свое существование, хотя бы тонкой нитью связаться с миром, не порывать связи с ним хоть через творение Божье – миницу и небесную музыку органа…” [3, с. 292]. Драматург раскрывае вобраз Кастуся Каліноўскага праз шматлікія сцэны допытаў і вялікія маналогі, дзе Каліноўскі імкнецца асэнсаваць прычыны і наступствы паўстання 1863–1864 гг. Народны змагар упэўнены: ўсё, што зроблена асабіста ім і яго паплечнікамі, будзе адпаведна ацэнена толькі наступнымі пакаленнямі. Менавіта праз іх чытач (глядач) даведваецца пра падзеі, звязаныя з паўстаннем 1863–1864 гг. Каліноўскі на допытах не называе ніводнага ўдельніка паўстання, які яшчэ жывы.

Выключным тыранам і жорсткім заваёўнікам выступае ў п’есе Мураўёў, якога ў народзе празвалі “генерал-вешальнік”. Драматург па-майстэрску выкрывае героя, малюе асобу генерала. Менавіта з яго дамамогай быў зачынены Віленскі ўніверсітэт, адмена дзейснасць Статута 1588 г., скасавана Брэсцкая унія і г. д., што ў выніку прывяло да наступнага: “аборигены почти забыли, не только какого они роду-племени, но и свой идиотский диалект” [3, с. 289]. Мураўёў бачыў у К. Каліноўскім моцнага супраціўніка, якому ўдалося паставіць пад свае сцягі тысячы людзей. Лепшая будучыня народа – гэта асноўная мэта жыцця К. Каліноўскага. Відавочна, што ў п’есе “Рыцар Свабоды” А. Петрашкевіч найбольш паслядоўна вяртаецца да традыцыйна-рамантычнага ўзнаўлення нацыянальнай гісторыі.

Цікавай па спосабе падачы інфармацыі і стварэнню вобразаў дзеючых асоб з’яўляецца п’еса А. Перашкевіча “Крыж святой Еўфрасінні. Фантасамагорыя”. Да ўласна гістарычных драм п’есу А. Петрашкевіча мы аднесці не можам, але гістарычны аспект у ёй відавочны. Сюжэтам гэтай п’есы паслужыла шматвяковая гісторыя “пакут” святой рэліквіі беларусаў – крыжа Еўфрасінні Полацкай. Драматург пабудаваў сюжэт у форме суда, які адбываецца на тым свеце над тымі, хто меў дачыненне да знікнення крыжа з беларускіх зямель. Перад намі праходзяць, вядомыя і не вельмі, гістарычныя асобы, пачынаючы з Валодшы – князя Полацкага, Давыда – князя Смаленскага, Васіля III – вялікага князя Маскоўскага, Івана IV Жахівага, Мікалая I – імператара Расійскага, Стэфана Батуры, Базыля Лужскага – архіепіскапа Полацкага, і завяршаючы Вацлавам, прадстаўніком XX ст., якога называюць “звычайным наццэмам”.

Драматург прасачыў магчымыя шляхі блукання крыжа па “розных руках”. Над кожным з магчымых трымальнікаў святыні адбываецца суд, дзе ў якасці абвінаваўцы выступае Лаўрэнцій (Берыя), а ў якасці абаронцы – Анёл. Кожны з гістарычных персанажаў апавядае сваю гісторыю, звязаную з крыжом, але кожны з іх выкарыстоўваў крыж на сваю карысць: імкнуўся прыдбаць грошы, захапіць уладу, маёмасць. Але самы жахлівы лёс напаткаў крыж у ХХ ст., бо гэта было стагоддзе пакут не толькі крыжа, але і ўсёй нацыі: “Рабунак культурнай спадчыны народа адбываўся з мэтаю разбурэння нацыянальнай свядомасці народа” [4, с. 157]. Гісторыя выратавання святой рэліквіі звычайнай жанчынай Фросяй найбольш уражлівая. Крыж – гэта не толькі святыня, за ім бачацца шматлікія забітыя, знявечаныя і забытыя людзі. Праўдзіва і пераканаўча А. Петрашкевіч адлюстроўвае псіхалогію шараговага, маленькага чалавека, які завалодаў скарбам і гатовы на ўсё дзеля асабістага ўратавання: “Хто будзе перамагаць, таму і аддадзім…” [4, с. 163], ці: “Я праваслаўны атэіст і грахам сваім даўно лік згубіў. Ці ты думаеш, што за мною толькі гэтыя трое?” [3, с. 164].

А. Петрашкевіч звяртаецца ў сваіх п’есах да белетрызацыі гісторыі, умоўных дапушчэнняў, а таксама ідэалізацыі галоўных герояў, бо гістарычная трагедыя ў яго творчасці застаецца найперш формай для яскравага адлюставання барацьбы беларускага народа за свабоду і незалежнасць. У сваёй драматургіі А. Петрашкевіч не меў на мэце з фатаграфічнай дакладнасцю адлюстроўваць мінулае свайго народа. Перш за ўсё ён маляваў рамантызаванае, яркае і жывое аблічча пэўнай эпохі.

Падзеі, якімі насычана беларуская гісторыя, робяцца асноваю такога драматургічнага канфлікту, які перш за ўсё павінен адлюстроўваць пэўную заканамернаць: смерць герояў – гэта непазбежны вынік супрацьстаяння паміж законамі гістарычнай неабходнасці і практычнай немагчымасцю яе рэалізацыі (канфлікт са сваім часам Купалы, Каліноўскага, ідэй Еўфрасінні Полацкай).

**Літаратура**

1. Гаробчанка Т. Неўміручасць гісторыі // На мяжы стагоддзяў: Сучас. бел. драм. тэатр. Мінск, 2002.
2. Айзенштадт У. Вступление // Русская советская историческая драматургия. Харьков, 1969.
3. Петрашкевіч А. Рыцар Свабоды // Здрапежаная зямля. Гістарычныя п’есы. Мінск, 2003.
4. Петрашкевіч А. Крыж святой Еўфрасінні // Бацькаўшчына: Зб. гіст. літ.: для сярэд. і ст. шк. узросту / Уклад., прадм. С.С. Панізніка. Мінск, 1998.